# БЮЛЕТЭНЬ

**для галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме ў Рэспубліцы Беларусь 24 лістапада 1996 года**

Пры галасаванні адно з слоў **«За»** ці **«Супраць»** па кожнаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум, выкрэсліваецца

## ПЫТАННІ, ЯКІЯ ІНІЦЫІРАВАНЫ ПРЭЗІДЭНТАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

1. Перанесці Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень рэспублікі) на 3 ліпеня — дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне.

**За** ці **Супраць**

2. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь), прапанаванымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

**За** ці **Супраць**

3. Ці выступаеце Вы за свабодную, без абмежаванняў, куплю і продаж зямлі?

**За** ці **Супраць**

4. Ці падтрымліваеце Вы адмену смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь?

**За** ці **Супраць**

## ПЫТАННІ, ЯКІЯ ІНІЦЫІРАВАНЫ ДЭПУТАТАМІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

5. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў.

**За** ці **Супраць**

6. Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады выбіраліся непасрэдна жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі?

**За** ці **Супраць**

7. Ці згодны Вы, што фінансаванне ўсіх галін улады павінна ажыццяўляцца галосна і толькі з дзяржаўнага бюджэту?

**За** ці **Супраць**

* * *

Калі пры галасаванні па кожнаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум, не выкрэслена ні адно з двух слоў — «За» ці «Супраць» — або выкрэслены абодва гэтыя словы, бюлетэнь у частцы дадзенага пытання прызнаецца несапраўдным.

Калі пры галасаванні па другому пытанню, якое вынесена на рэферэндум Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і па пятаму пытанню, якое вынесена на рэферэндум дэпутатамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, адначасова ў бюлетэні выкрэслена слова «Супраць», бюлетэнь у частцы гэтых двух пытанняў прызнаецца несапраўдным.

Заключэннем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 1996 года № 3—43/96 прызнаны не адпавядаючым Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь пункт 3 пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 6 верасня 1996 года «Аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндума ў Рэспубліцы Беларусь і мерах па яго забеспячэнню» у частцы вынясення праектаў змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі на абавязковы рэферэндум.

